Міра Лукша

# Замова

Беласток 1993

Рэдактар
Міраслава Лукша

Тэхнічны рэдактар
Юры Хмялеўскі

Камп'ютэрны набор
Яўгенія Палоцкая

Карэктар
Аліна Леванеўская

***

народжаным у Гайнаўцы
ў золкі восеньскі ранак
народжаным у Нарве
ў гуллівую летнюю ноч
народжаным у Саколцы
на руках цёці Надзі і Веры
народжаным у Бельску…
у белых шпіталях
калі апошнія цягнікі
ад'ехалі ў морак
маёй маме ў 39 годзе
вынятай з жывога жывата
паміж Семяноўкай а Беластокам

выйшла з лямпай у агарод
наша баба Люба
вецер вецер
баба Люба нам свеціць
рукою шкло захіляе
ад злога вока
ад памору
ад нажа
ад каменя

***

Тата, сыпецца снег.
Не на тваю шапку-аблавушку,
не на твае нессівелыя валасы,
не на цвёрдыя рукі,
што не ўмелі песціць дзяцей.

Тата, дождык ідзе ад Баб'яй-Гары,
па лонках, па бярэзіне, па грэблі...
Па шыбе коціцца, плача.
А ў печцы, у сцяноўцы, агонь гудзе,
з бярозавых пален сцякае сок.

Тата, шэрань на яблыньках.
На яблыньках ружовыя кветкі.
Румяныя яблыкі падаюць на траву.
Давай, пойдзем у садок, пазбіраем.

**ДРЭВА**

кара дрэва
кара
не вырвацца яму
з-пад кары
ад карэнняў
ад кароны
яму
каралю ясакару
пакорыць яго
карпатлівы пакорлівы карлік
карнік караед

**ЗАМОВА**

- Сею, сею...
- Што ты сееш?
- Пярэпалахі!..
- То сей, каб не было!

Вазьмі ты, вецер ціхі,
ветравое ліха;
дзе ты гуляў,
дзе ты майго любага
балезняю сустракаў,
што ж ты яму даў, -
каб назад забраў!

І ссылаю цябе, ляк:
забярыце, ляк, бабы, у чапцы,
мужчыны ў шапкі,
дзеўкі ў косы,
хлопцы ў магеркі...

І нясіце...
на мхі, на балоты,
на стромкія горы,
дзе вецер не вее і людзі не ходзяць,
пеўні не пяюць, ваўкі не выюць.

Патуль хадзіла, пакуль ухадзіла,
угаварыла,
высылала з жыл,
з чуткіх вушэй,
з зоркіх вачэй,
з чырвонае крыві,
з жоўтае косці,
з буйнае галавы,
з шчырага сэрца,
з пругкага цельца...

Не бойся... Сею-сею...

З попелу быльнёжнага,
з вады свянцонай,
слёзкі калёнай
з відушчых вачэй.
З крывінкі чырвонай.
З сэрца адданага,
збалелага.
Не бойся!

На чорны лес,
на зялёны лугі,
на сіне мора,
твой ляк, мой любы.

***

адпушчаны грэх
васількі ў змоклым жыце
вясёлка над вернай хатай

***

Не кажыце Спарце,
прахожыя,
не кажыце,
што я тут ляжу,
яе сын,
забіты на вайне.

І не выйграў я,
і не забілі
ворагі мае
мяне.

Не збярог сябе
я,
а ратаваць хацеў
усіх!

Не кідайце мне
ні слязы,
ні каменя,
ні слова.

Хай бы
і не было мяне
сярод барацьбітаў,
што нарадзіліся

для справы,
для слова,
для славы.

***

Як гэты студзень студзіць косці
пальцы ў атраманце марозіць
- бо ліст пісала я да болю
на белай карце свайго цела
а снежны ліст зняла адліга
а слёзы ўсе са стрэх упалі

замерзлы чорнай лустай груд
звініць пад кожнай зоркай снегу
што ціха хоча там прылегчы
гарбеюць пальцы сэрца стыне
ў панцыр закованае рэбраў
і капае з губоў атрамант
пячэ - мароз ці зубы цісьнуць?
чырвонай ружай - кветкай шчасця
вяну на чыстым снезе скуры

***

штодзень шукаю непрысутнасць
штодзень чакаю непрысутнасць
ў няспынным дні нараджэння

***

Не дзялю сябе
ні з кім я
з кім я

***

я лячу да тваіх рук
і ты не ў іх
хаця яны ў цябе
аж завялікія
каб абняць свет
- прыручыць
высловіць?

і пад сонца
на сцежку
пад імі не глядзіш -
не асляпіць яму
цябе
сваёю існасцю?

палыновы пах
горкіх пальцаў
піша гарачыя вусны

***

Ходзіць па месце чалавек з асадкай.
У торбе пукатай з канапкамі, з півам
Асцісты посны верш загорнуты ў газету.

*ёсць такая пара перад ад'ездам...*
Надзея Артымовіч

***

час
сухой скуры гарачых далоняў
кропляў горычы нікаціну
на прыкушаных вуснах

зоркапад слоў
маўчанне

затрымай свой профіль
на мурах горада -
яны тут застануцца
а толькі мы бачым
яны ж жывыя
і толькі чакаюць
каб заўважыць іх рух
хітрыя зіркі вокнаў
крананне часам
рэбраў жалезабетона
пяшчотнае нахіленне
сцен да паветра
над сцежкамі ў прасторы
трактамі лёсаў людзей
а тыя нават не заўважаць
калі і зрок іх разаб'ецца
аб камень колер чысты гук
абрыс і глыбу цела атам

ты бачыш

рассцілаю вачэй тысячу
а сцяна разумее
прагу сталасці
неспакой акамянець

крышацца год і хвіліна
- порах на языку
слова - сліна і цэмент
цішыня

ці ведаеш

сёння
уцякаеш у свае сцены
нахіленыя дружна над табою
кажаш: мой мур мой выбар

слова не камень
а як косць жывая
ў горле...

крычым у натоўпе на вакзале
а можа гэта цішыня
як на аэрадроме
ў нас разрываецца

адно ўжо толькі супольнае
хвіліна перад дарогай
і ніхто не заўважыць
разбіўся яшчэ адзін пейзаж
адным начным метэарытам

**ФУГА**

адышоў мой анёл спакою
пачакаю-сказаў

над вялікамі вазерамі іду
з каменьчыкам у вуснах
гладкім тысячу гадоў
вада яго цалавала

сяджу на камені
амшэлым з паўночнага боку
Вялікая Мядзведзіца
месяцы на вадзе

сляпыя вандравалі на ўсход
а дробныя хвалькі
кранаалі іх белыя ногі

усё тут не тваё
напішы свой апошні верш
кінь фатаграфіі на ваду
распазнай людзей
заклятых на вечнасць
у чарнату і бель

Геранім быў хвілінку каля мяне
з яго далоні капалі салёныя кроплі
снягір звіў гняздо на яго плячы

што робіш ты тут у такую пару года
сузіраеш смак сонца на вапенных скалах
пагода на добрых людзей добры ўлоў слоў
да пабачэння...

на шляху сустрэлі Уласа - трываў
распяты паміж фіялетавымі дрэвамі
вузкі як ластаўка і звонкі

ведаеш - адышоў мой анёл спакою
так - пакінуў нам штосьці
каменны каляндар і кніжку
месца ў прасторы
гулкі час

* * *

сон расплюшчыў у табе вочы
дрэва агню вады заранкі
нарадзіўся камень шэрая зязюля

***

Матылёк - трывожны пасланец ночы.
Матылёк сваёй пані баіцца.
Матылёк аслеплены выбухамі белага святла.
Матылёк з незагоеным пялёсткам крыла.

Самотная былінка травы.
Абмінула яе шчырая каса,
Іншым травам зламаўшы каленцы.

Шчылінка крыку ў прасторы.
Асколак няўмольнага часу.
Недапітая сляза расы.
Зорны пыл на астылай зямлі.

## МЯСТЭЧКА

Дзень белы у мястэчку шэрым.
Пусты аўтобус пыл глытае, -
Забрацць нас хоча ў жвавы горад.
Пад грушай ссохлая валошка
У жыце чорным, пераспелым.
Камень у кветку прарастае
На градцы бурай, здзірванелай.
Герань вазон карэньчыкам кранае
На вокнах чыстых, у фіранках.
А дзе чарнее смерцю шыба,
Трупок раслінкі ў чыгуне.

**ШАГАЛ**

Не збярэш у далоні ужо
З рассыпаных пацерак зорак.
Разарваны міжволі шнурок
Уеўся ў пальцы крывавым узорам.

Не даганяй ветру, не даганяй,
Не пытай ветру, не пытай!
Як у прыску рубінавы міг,
Так на золку пагасне хвіліна...

Я цябе не шукаю ужо,
Не блукаю па ўзгорках спакою,
Дзе ад хмараў павісла святло
У хісткіх струнах над шэрай Дзвіною.

Можа ўскочыць у плыткі мне сон,
Захлябнуцца горкай слязою,
Альбо ў вуснах заціснуць той тон -
Гук прыглушанай колерам мроі?..

І чужых мне вачэй так шкада...
Колюць гострай іголкай у сэрца.
У люстэрку халодны скразняк
Б'е валоссю балюча у шкельца.

Усс хапаеш у далоні вагонь -
Чысты боль паэта, прарока.
Горкім сокам спаўзе у далонь
З пэндзля фарба слязой адзінокай.

Не даганяй ветру, не даганяй.
Не пытай ветру, не пытай.
Як у прыску рубінавы міг,
Так на золку пагасне хвіліна..

***

у слотны вечар
сабраўся
на вуліцы
тлум:
чакае
твайго палёту

балюча рвуцца
ржавыя харугвы
вецер нізка нясе
папяровую мову
дарослых людзей

у слотны вечар
тлум гадуе чаканне

## МЕСТА

У вечным месце вечна вее вецер.
У вечным месце ёсць пустыя пляцы,
Дзе тоны бетону прыдушваюць цэрквы, касцёлы.
У вечным месце госцю паказваюць тое, чаго няма
Людзі, якіх места не зойме ніхто і ніколі.

***

выбраўся ты на вайну без вяртання
пабег цераз поле вярбою хрышчонае
слязьмі пражагнанае потам крывёю
напіўся узгрэты халоднай вадзіцы
з крыніцы пахмельнай над ярам бяздонным
аслеплы ад бляску што выплыў зміж рэбраў
і выліўся ў белае сонца над краем

і здароўю зашкодзіў сказалі вандроўцы
глухі што кульгавага вёў нёс кульга сляпога
а ты анямелы аслеплены голы
хацеў яшчэ скрыць сваю нагасць і ляк і знямогу

а няма ўжо вяртання з вайны без вяртання
для таго каму Бог дазволіў быць богам

***

як страшна калі адным словам
схочаш выкрасліць тое што было -
і сонечнае захапленне маем
і дождж што нашы слёзы змыў
і абразы што ў сэрцы заквіталі
пад пэндзлем і ў вачах раслі
і кніжкі што дарылі мы няўмела
за дружбу вечную складалі на алтар
на вогнішча што трапяткім жыло

згарэлі мы згарэла ўсё датла
і сівы попел пад расой нямее
і нельга нам ніколі ўжо зайсці
куды і жрэц мог толькі раз заглянуць
памыты чыста і ў адзенні белым

не мы ўжо і не мы тады былі
загледжаныя з верай у сябе
часам бязлітасным параненыя птушкі

***

ў самотную месячную поўнач
ў гулкім пакоі за збялелымі сценамі
фармуеш возера пяском гарачых рук

***

усмешка -
стрэл
усмешка - матыль
усмешка - прагані-жаль
усмешка - забудзь
прабач

***

жанчына
з яе ран
нараджаюцца
ранак і дзень
і ноч раны гоіць
і раніць

жанчыну
нараджаюць
ранак і дзень
і ў ноч адыходзяць
разам

***

адыдзіце ад нас
злосныя прывіды
дзяды хворых бацькоў
акалелых без часу
хто мячом ваяваў
брата пікай прабіу
ламаў дзверы суседа
піце кроў чорнай вады
не закусіце хлебам
не падзелімся з вамі
ў час новай бяды
белай смерці ад неба
спарахнелі ў курганах
ўжо вашы мечы і стрэлы
толькі хцівая кроў
забітых пад бельмам
ржавага месяца ў поўню
ў чорнай поўсці ваёў
б'ецца ў вашых
крывіцкіх сынах ачужэлых

***

маскі нашых твараў
палосамі пакрываюць
шкарлупіну зямлі

штораз малодшыя
з мяцёлкай прабуюць
дабрацца да нашых
вачніц

якія прыгожыя кветкі
растуць з нашых воч
а трава заглыбляе
карэньчыкі паміж зубамі

выпарваюцца літары
выветрываюць лозунгі
тлее папера
эпас ржавее

уцякаеш
на верасьнёвыя выганы
- там халоднымі вуснамі
скажаш мне
я адзін
і неба зорнае ўва мне

***

на табе хлеб
еш
і не будзе табе болей страху
на табе ваду
чыстую:
пі
вымый свае чорныя вочы
на сябе паглядзі
не будзе бяды
не будзі толькі бяды
сваімі вачыма
еш хлеб
печаны на аеры
ў матулінай печы
не апячы толькі рук
а апячэш
пацалую твой боль
і не будзе табе болю

***

ем дзікі плод у старажытным садзе
дзе дрэвы памярцвелі у чаканні цуду
ў драпежную спасаўскую ноч

***

кароткі сон
у выстылым доме
зорны мак
не прысыпле павек
йскрыцца снег
на жалезным балконе
што павіс
нада мною
як грэх

***

Двое згорбленых, у колкай цішыні,
П'юць старое моцнае віно;
Яго хаваў адзін для аднаго,
зайздросна, не чакаючы ўжо госця...
У келіху шчарбатым, непрыгожым
рубін - сляза і кроў, і вернае маўчанне.

**ТРАВА**

цалуюць пальцы
валасы травы маладыя

трава ведае
косткі пальцаў
смак чалавека
заўсёды жывога

карэньчыкам
лістком
зярняткам
ведае яго
чакае

смяецца ціха пад намі
скамечаная
смяецца

***

застукаў у дзверы госць з маёй Айчыны
пабіты парог перакрочыў пакалечаны босы
і маўчаў і мы доўга глядзелі ў агонь

***

светлы дом
дом без вокан
сам акном

вятры гуляюць
люляюць
на моцных руках

мяне гушкаюць
мой добры дом
без сцен і вокан

***

пасаджу ў агародзе на выветраным кургане
закапаю у глебу ў лісце карэнне і косткі
парошчанае зерне выгрэтае пад языком

***

ціха падае снег
маўчыць белы дом
да хмар высокі
як ніколі

***

Адчыні ўсе брамы
ў стары сад
у найбольшы
незалсжны сад у свеце

Дзедаў сад
на скрыжаванні вятроў
на чарнобылі раса
мае босыя ногі

і з кучы церняў
пырсне ружа

шэры мур у воспе куль
старыя жанчыны стаяць
слухаюць ветру
кроў цямнее
ў шчыльных бёдрах
з якіх чужыя забралі сыноў

За мурам за садам
мяжа княства

***

мы беглі да белага горада
самі белыя ў шрамах змаршчын
бязлітасна маладыя
плылі як хусткі шорсткія
чорныя
на вятры
слёзы абсыхалі
беглі мы да сябе
лютыя і простыя

і ноч нас даганіла
босых
да смерці ўскрываўленых

заўтра будзе ранак
ран поўны і спеваў

***

іду па разлеглым пляцы адна-не адна
цені іншых імён ляглі мне на плечы
хоць вочы хусткай павязаны - бачу

***

агні апалі крумкач прынёс сонца
вялікі плод цяжарны дабром
сок яго сплываў на сухую лаву
гарачыя яшчаркі сонсчныя асколкі
кавалкі кварцу слюды бстону
застылыя жылы жалеза
крывавую іржу
і прабач мне Ойча
ў час плачу і смеху
дажынак і скрыгату зубоў
што я ўсё
над водамі Пачатку

***

рэчы сочаць за намі цярплівыя злосныя
ў люстрах прасторы кінутага месца
непрысутных калысак і трунаў сасновых

***

і гэты час прыходзіць
калі прыліў мора
забірае нам гітары
іграючы за нас
рэквіем і для прасторы
што яшчэ перад намі

нашы вочы ясныя
уцякаем на фіёрды
будзеш адзін
калі палаюць макі
- не шкадуйма іх
безудзельныя і нешчаслівыя

далёкі крык тлуму
смерць у святлах рампы
першая калонка
апошняя паслуга

***

у гэтым доме не памёр ніхто
толькі кожную ноч
цямней на яшчэ адну
ноч

## З КАЗКІ АНДЭРСЕНА

баішся вясны
мой Кай
званочкі санак Зімы
цябе так цешаць
імкненне замыкае вусны
іголак тысяча
бяжыць па горле
ў сэрца

Кай-
не буду цябе трывожыць
не пайду за табою
на полюс
дзе замкі з ільду
і свеціць паўночнае ззянне

не пайду
не пабягу за табою

можа...
басанож...
а кроў пабяжыць
за мною
пурпуровымі ружамі
нецярплівых слядоў
Кай маіх да цябе

але о Кай маўчу

а марозныя кветкі
рысуюць мне вочы далоні

і толькі кроў расквітае
пад белым цесным бінтом

***

Быў час
збіраць камяні.
Час зерне класці
ў раллю.
Сперазання поўных снапоў
для чужых.
І далі яму свае
грошык у дамавіну.

***

дай мне сонца
спелае
тваіх вачэй
пад сівым лёдам
холаду нямога
дзе снягі-словы
на вяршынях гор
па-веснавому таюць

ўвядзі у лес
дзе чым глябей
тым дрэвы вышэй
неба падымаюць

дай слова мне
у жнівень сноў
дзс косы сонца
лета дажынаюць

і лета дыхае пажарам

хай спапялею я датла
адною іскраю занята

**БАРАВЫЯ**

*Кандрату Кастанчуку*

Быў сабе Бораў-Дзік.
Араў і гарадзіў,
Карэнне варочаў.
Багно прагна паравала
Пад Баб'яй гарою.
Брат Мядзведзя лічыў соты,
Сачыў за куніцаю,
Валачыў валуны
Па дарозе ў Пасекі.
Сонна Нарва плечы грэла,
Сцёбала лазою.
А цяпер бераг ёй
Вышэй воч падымаюць.
І схаваецца яна, прытуліцца
Да дна, дзе пясочак
Перамуляны, launched
Нагамі Баровымі,
Лапцямі ліповымі.

***

ідзе зіма - сказалі птушкі

і зноў вандруем у краіну Вырай
над лёскатам забытых церніц
над выгарэлымі вачніцамі кастроў

***

баюся я
Ты можа расснуешся
пад зрэнкамі маімі
ў баб'ім леце

паветра звонкае
кранае твае пальцы
вочы і вусны
і пінжак наўсцяж

грамы ідуць ад Заблудава
уздыхае вецер - бура сілы
зграбае па-над Беластокам

гуляе вецер валасамі
перасыпае і шапоча
лісцем апаўшым непатрэбным

і рыне раптам дождж
і звяжа
нам рукі з хмарамі
епітрахіляй
і будзем разам
- хоць не можам -
два ручайкі
адной вады

***

я чую як па венах
сястрычка мая белая
вяслуе ціха плюскае
а чайкі майго страху
з яе далоні п'юць спакой
па кропельцы гарошынцы

сястрычка - бела кветачка
гваздзіка з галоўкай уніз
плыве і гладзіць кроў
пялёсткамі памерзлымі
ў тунелі ўніз галоўкай
сястрычка мая белая
ў гулкіх каналах венаў
гваздзіка мая горкая

***

дом не хоча выпусціць твайго цяпла
з пальцаў сучкоў з-пад павекі парога
шыба дрыжыць зерне рассыпалі на падлогу

## СЭВІЛЬЯ

белы горад у сонцы
асляпіў мяне дрыжу
белы горад дрыжыць і дзьме
мне ў твар зялёным
ветрам жоўтым ветрам
ветрам чырвоным
дзьму ў твар беламу гораду
смехам што дрыжыць ува мне
дрыжыць ува мне Фэдэрыка
і гладзіць марозным пальцам
мае спаленыя сонцам вусны
белы горад дрыжыць ува мне

## ***

Хто табе ўслед
Кінуў нож?
Можа, твой цень
Табе аддаў?
І не памогуць
Ніякія замовы,
Ні поўны кубак
Жывой вады...
Не зажывеш.

***

будзем блукаць без мэты
адзетыя ў зялёныя футры
з моху як ясакары
што стаяць і ідуць
на поўнач

ведаеш: компасы
непрыгодныя для нас
мы поўнач чуем у косцях
*п о ў н а ч*
кажаш
а вочы ў цябе
як паўночны мох
мяккі і жорсткі -
алень што паднябенне
мае ядвабнае скажа
які смак паўночнага моху -
я не смелюся

калі
палае паўночнае ззянне
маўчым
маўчым князь

***

якія добрыя мы
калі п'ем ваду

вяртаецца к нам сіла
з жаданняў маці: сыну
няхай цябе божая раса
блаславіць няхай
ногі абмые напоіць
у спякотны дзень
слязой сардэчнаю
маёю
няхай -
ачысціць

вада прачыстая

***

у белай сукенцы на выбеленым на росных лугах радне
корань агню гадуе хавае ў далонях ад ветру
гадуе пакуль у моц не ўзрасьце і яго не пакорыць…
узрастае на вуснах мак рвецца ў пальцах дыханьне
на белых сукнях сьцягоў макам гарыць Алаіза

***

іду белым горадам
маладыя крылы
ў мяне растуць
падымаюць на спіне
кашулю: трэснула!

- белыя крылы ў мяне
выраслі!

дзеці з белага горада
цешацца-
анёл ходзіць па вуліцы
і спявае
песню беларускую

яны хочуць таксама
мець такія пёркі

***

павссілі на сцяне нашага вакзала
расклад усіх цягнікоў да дабра і зла
ды нікому не ведаць дарогі
да Ітакі ссівелай што ляжыць неўрадлівая

## КАЛАСЫ

Над пожняй счарнелай, над з'езджаным полем,
Над каменем гострым, над каменем гладкім...
Як цяжка таму, хто ведае болей,
Стаптанага жыта збіраці астаткі,

Не меўшы надзеі, хоць маючы Слова,
Якое з пачатку сусвета гучала...
О, Ойча, Ты ж нашаю, простаю мовай
Сказаў жа: «Хай будзе!» - і ўсё так паўстала.

Не дай жа таму, што ходзіць па полі,
Скалоўшы да крові і рукі, і ногі,
Не дай жа яму, не дай жа ніколі,
Каб болю не чуў; хай крычыць ад знямогі;

Хай крычыць - ён жа выбраў; ад крыку ступее
Іншы боль - боль самоты, боль нажа спадчыннога.
Вось там іншы ідзе, сівы, без надзеі,
З парожняй сявенькай ад гнілога парога!..

***

накоплiваю словы
а яны сыпкiя
як белы рыс
сыплюцца
цiха сыплюцца

мiнаю iх
ведаю
дзе сэнс
рахунак
- разумнаму мяне вучылi
ў школе

холадна мне
п'ю ваду дыхаю
сумую
не ведаючы смаку слёз

выходжу па агонь
вяртаюся позна
не зведаюць сваiх сцежак
два адзiчэлыя каты

***

страцiў я
толькi адно жыццё
стаўся
магiлай дзiцяцi
а цяпер прашу
кропельку вады
прахожы!
i нiчога
не кажы Спарце

***

канчаецца на мне
адна з крывава-чорных нітак
з клубка Скарпіёна

***

Цікава,
хто ж сёння
завязаў белы бінт
на вачах
Справядлівасці?

...але гэта ж яе...
асляпілі?! .

Але ж, пэўна,
не тыя,
хто верыць
у беспамылковасць
такое постаці!

***

пакуль усё ў табе
ёсць зрокам
пакуль усё ў табе
ёсць мовай

не ўбачыш
не скажаш
не будзеш

**КРЫК**

Вецер гоніць
Белу хмару
Па сіні паблеклай.
Гнеўны коннік
З нашых мараў
Вырваўся із пекла.

Людзі вочы
Апусцілі,
Быццам грош шукаюць.
Ці падкову
Залатую
Кінуць ім - хай маюць?

Чорны горад
Чорным ветрам
Дыхае да болю.
Ці крых зглухне
У сценах нетрах?
Вырваўся б на волю!

Вецер гоніць
Белу хмару
Па паблеклай сіні.
Ці дождж чорны
На той горад
Сляпой смерцю рыне?

Вецер гоніць
Белу хмару
Над спаленым полем.
Чорны прысак
У маім сэрцы
Так пячэ, так коле.

Чорны горад
Чорным ветрам
Дыхае да болю.
Ці крык зглухне
У сценах-нетрах?
Вырвецца на волю!

*ліпень 1991 г.*

***

і прыходзяць яны
да мяне
і стаяць
светлыя

зведаць абшары ночы
слоў і моцы
святла
без самоты

## ЗАВЕЯ

Галоднай ночы гостры бераг.
Палын на вуснах так ціха спее.
Паранены ў палёце голуб
Прыціх за вэлюмам завеі.

І зноў гэтая чорная конніца
Прабяжыць па стомленых грудзях.
З гэтай злоснай сяброўкай-бяссонніцай
Дачакаць мне зноў золку ў дзвярах.

Зноў белыя лёзы світання
Балесна зраняць мае вочы,
І застанецца зноў чаканне
Губ палыновых горкай ночы.

Адна была ў мяне надзея:
Што вернецца зноў маё шчасце.
І хоць на вуліцы завея,
Усё ж адкрыю вокны насцеж!

І зноў гэтая чорная конніца
Прабяжыць па стомленых грудзях.
З гэтай злоснай сяброўкай-бяссонніцай
Дачакаць мне зноў золку ў дзвярах?..

## ЖЫВІЦА

многа агню
сыплецца іскрамі
божымі
над верашалінамі дрэў
распятых пад нашым небам

прыляж да зямлі:
як дыхае
грудзьмі паўнаводнымі
як мякка песціць
нашы вочы далоні

ад нашых вуснаў
паветра плыве
да хмар

цішэй:
гоману нашых дзядоў
адбітае рэха
ў паветры гучыць

жменю слязы
ад гарачай кары
дало мне
вішнёвае дрэва -
словы пякуць
ад жывіцы
жыцця

***

а калі
выплывуць з мяне
ўсе словы
як паводка крыві
паўнаводдзе
выступіць з берагоў
заліе вёскі
лугі і паплавы
пад лес падыйдзе
баюся
што скажу сябе з а ў с я
безабаронная
пад высокім небам
без лета

***

будуць судзіць паэта
украў адзін дзень Богу
світанак Слова найсампершы

## АТЛАНТЫДА

вечны дом паэтаў
пад вадой
сум па кінутым доме
дому сум

***

горкая травіца
сонніца-быліца
да сцежкі нахіляецца
ў пояс пакланяецца
просіць прытуліцца
расы з лістка напіцца
а хто дакранецца
суму набярэцца
і захварэе
і занямее
і затравее
і скажа слова
зялёнай мовай

## ЗМЕСТ

народжаным у Гайнаўцы
тата, сыпецца снег
Дрэва
Замова
адпушчаны грэх
не кажыце Спарце
як гэты студзень
штодзень шукаю непрысутнасць
не дзялю сябе
я лячу да тваіх рук
Ходзіць па месцы
час
Фуга
сон расплюшчыў у табе вочы
Матылёк
Мястэчка
Шагал
у слотны вечар
Места
выбраўся ты
як страшна
у самотную
усмешка
жанчына
адыдзіце ад нас
маскі нашых твараў
на табе хлеб
емдзікі плод
кароткі сон
Двое згорбленых
Трава
застукаў у дзверы
светлы дом
пасаджу ў агародзе
ціха падае снег
Адчыні ўсе брамы
мы беглі да белага горада
іду па разлеглым пляцы
агні апалі
рэчы сочаць за намі
і гэты час прыходзіць
у гэтым доме
З казкі Андэрсена
Быў час
дай мне сонца
Баравыя
ідзе зіма
баюся я
Я чую як па венах
дом не хоча
Сэвілья
Хто табе ўслед кінуў нож
Будзем блукаць без мэты
якія добрыя мы
у белай сукенцы
іду белым горадам
павесілі на сцяне...
Каласы
накопліваю словы
страцў я
канчаецца на мне
Цікава
пакуль усё ў табе
Крык
і прыходзяць яны
Завея
Жывіца
а калі
будуць судзіць паэта
атлантыда
горкая травіца

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год